# Прэзентацыя паштовага праекта, прымеркаванага да чэмпіянату свету па баскетболе ФІБА - 2018 сярод дзяўчат да 17 гадоў

Сёння, 19 ліпеня, у канферэнц-зале Фалкон-клаб адбылася прэзентацыя паштовага праекта, прымеркаванага да чэмпіянату свету па баскетболе ФІБА - 2018 сярод дзяўчат да 17 гадоў, які пройдзе ў Мінску з 21 па 29 ліпеня.

У цырымоніі ўрачыстага гашэння прынялі ўдзел:

- старшыня Беларускай федэрацыі баскетбола **Максім Уладзіміравіч Рыжанкоў** ;
- намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь **Рабава Ганна Мікалаеўна** ;
- намеснік міністра спорту і турызму Рэспублікі Беларусь **Баравуля Аляксандр Іванавіч**.

На мерапрыемстве быў прадстаўлены і ганаровы трафей юніёрскага чэмпіянату, а таксама медалі ўнікальнага дызайну, які ўключае элементы брэндынгу ФІБА. Афіцыйным талісманам турніру стаў бусляня-баскетбаліст, які будзе называцца «Буслік».

Ужо сёння новы выпуск разляціцца на паштовых адпраўленнях па ўсяму свету і стане яркім экспанатам у філатэлістычных калекцыях.

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/20-07-2018-3338*